***Н.А. Багамольнікава (Беларусь)***

# ІМЯ М.В. ГОГАЛЯ Ў ТАПАНІМІІ БЕЛАРУСІ

Уласныя назвы розных геаграфічных аб'ектаў: мораў, рэк, азёр, балот, ручаёў, каналаў, гарадоў, сёл, вёсак, пасёлкаў, вуліц, плошчаў, завулкаў, астравоў і г.д. — называюць тапонімамі (ад грэч. *topos* 'месца' і *onyma* 'імя'), а іх сукупнасць – тапаніміяй. Кожны тапонім не проста ўзнік сам па сабе, у ім зафіксаваліся адметныя прыкметы геаграфічных аб'ектаў, розныя бакі чалавечага жыцця, канкрэтныя гістарычныя падзеі або асобы, асаблівасці ландшафту. Хаця тапонімы падпарадкоўваюцца агульным заканамернасцям мовы, аднак у залежнасці ад тыпаў геаграфічных аб'ектаў яны падзяляюцца на класы: айконімы (назвы паселішчаў), урбанонімы (назвы ўнутрыгарадскіх аб'ектаў), гідронімы (назвы водных аб'ектаў) і г.д. Тапанімічныя катэгорыі пры іх агульнасці маюць і адметнасці, таму дэталізацыя і разгляд іх паасобку дазваляе пераканаўча выявіць тыпалагічныя схемы намінацыі, прасачыць пэўныя заканамернасці ў называнні аб'ектаў, зрабіць вывады аб прадуктыўнасці-непрадуктыўнасці і ступені ўжывальнасці прадметна-тэматычных груповак. Даследаванні паказваюць, што найбольшая тыпалогія назіраецца паміж такімі класамі тапонімаў, як айконімы і гідронімы [1, 2]. У іх амаль аднолькавыя крыніцы паходжання і спосабы ўтварэння, такая ж разнастайнасць лексіка-тэматычных груп унутры онімаў.

Ва урбананіміі прынцыпы называння аб'ектаў складваліся своеасабліва. Напачатку назвы вуліц уключалі прадуктыўна ўказанне на фізіка-геаграфічныя ўмовы мясцовасці, пасля кола апелятываў значна пашырылася: па найменнях лінейных аб'ектаў можна было даведацца, якія ўстановы, прадпрыемствы знаходзіліся на іх або паблізу іх, чым займаліся жыхары (прынцыпы "*што было або што ёсць на гэтым месцы*", "*у накірунку да чаго-небудзь"*).

Старажытным па часе ўзнікнення з'яўляецца прынцып называння *па сувязі аб'екта з чалавекам*. У аснове назваў, асабліва завулкаў, знаходзіліся імёны, прозвішчы, мянушкі домаўладальнікаў. Асобныя тапонімы ўвекавечылі ў народзе імёны царскіх асоб. У 1882 годзе праз Беларусь праязджала Кацярына ІІ. Кацярынінскі шлях пакінуў "след": па яе загаду на тэрыторыі ўзводзіліся цэрквы. Так эклезіёнім (эклезіёнімы -- назвы цэркваў, часовень) ***Пакроўская царква***, пабудаваная ў стылі класіцызму ў вёсцы Гадзічава Гомельскага р-на, у народзе называецца ***Кацярынінскай царквой***.

Пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ўзніклі так званыя мемарыяльныя тапонімы, у якіх знайшлі адлюстраванне важнейшыя этапы і падзеі краіны – Айчынная вайна 1812 г., рэвалюцыя 1905 г., Вялікая Айчынная вайна 1941 – 1945 гг., розныя святы. Назвы адзначанай групы матываваліся прозвішчамі, псеўданімамі рэвалюцыянераў, дзеячаў партыі і дзяржавы, военачальнікаў, пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, вядомых вучоных, герояў мірнай працы. Аб'екты атрымлівалі найменні не толькі ў выніку падзей, што адбыліся на месцах, але і ў гонар гэтых падзей.

Унутры названага тыпу матывацыі актыўна і прадуктыўна выступае макрагрупа, у намінацыі якой удзельнічаюць антрапонімы па формуле –матыў *у гонар знакамітых людзей*. Знакамітыя людзі маглі мець нейкае дачыненне да мясцовасці. Пасля І падзелу Рэчы Паспалітай Кацярынай ІІ быў выдадзены ўказ аб будаўніцтве паштовых шляхоў (1773 г.). Так узніклі новыя дарогі, шырынёй у 8 сажняў, ці 2м 134 см. Яны былі густа абсаджаны абапал дрэвамі (каля 2000 дрэў на кожную вярсту), на іх будавалі паштовыя станцыі. Паштовыя шляхі перасякалі і Гомельшчыну. Па іх праехала нямала славутых людзей. Двойчы праз вёскі Гомельшчыны (Касцюкоўка, Клімаўка, Пясочная Буда, Маркавічы, Паддабранка) і сам Гомель пралягаў маршрут А.С. Пушкіна, які ехаў на Поўдзень у ссылку (май 1820 г.), а затым вяртаўся ў роднае памесце Міхайлаўскае (1824 г.). На жаль, свае ўражанні пра гэты шлях і ўвогуле пра шлях праз Беларусь паэт не пакінуў. Можа таму, што яго маршрут быў строга распісаны і ён не мог нідзе, акрамя паштовых станцый, спыніцца. Імя А.С. Пушкіна носяць на Гомельшчыне 26 лінейных аб'ектаў.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Двойчы быў на Гомельшчыне будучы кіраўнік сялянскага паўстання 1773 – 1775 гг. у Расійскай імперыі Е. Пугачоў: у 1764 г. у складзе карнай экспедыцыі расійскіх войск для выгнання рускіх стараверцаў у Гомельскім старастве, а затым ужо сам, ухіляючыся ад службы ў казацкім войску, у 1772 годзе ўцёк з-пад арышту і хаваўся ў стараверцаў Веткі. У Гомелі і Ветцы вуліцы названы ў яго гонар.

Як вядома, знакаміты рускі пісьменнік М.В. Гогаль нарадзіўся на Палтаўшчыне. Ён зрабіў рашаючы ўплыў на развіццё крытычнага рэалізму, станаўленне сатырычных жанраў і сцвярджэнне гуманістычных і дэмакратычных прынцыпаў у рускай літаратуры. Творы М.В. Гогаля аказалі ўздзеянне і на станаўленне як пісьменнікаў Я. Коласа, К. Чорнага, К. Крапівы, М. Лынькова. П'есы гэтага аўтара, у прыватнасці, "Рэвізор", "Жаніцьба" ставіліся шматлікімі прафесіянальнымі і самадзейнымі мастацкімі тэатральнымі калектывамі.

Імя М.В. Гогаля стала "будаўнічым матэрыялам" і для тапаніміі Беларусі, асабліва прадуктыўна ва урбананіміі. Каля 60-і лінейных аб'ектаў (бульвараў, вуліц і завулкаў) названы ў гонар пісьменніка ў такіх гарадах, як Асіповічы, Брэст, Баранавічы, Барысаў, Браслаў, Быхаў, Віцебск, Ваўкавыск, Ганцавічы, Горкі, Гродна, Драгічын, Жабінка, Каменец, Клецк, Кобрын, Ліда, Лунінец, Любань, Мінск, Магілёў, Маладзечна, Нясвіж, Навагрудак, Орша, Полацк, Паставы, Пружаны, Слаўгарад, Слонім, Талочын, Чавусы, Чэрвень. Яго імя захоўваецца ў назвах вуліц і завулкаў гарадскіх пасёлкаў Антопаль, Арэхаўск, Бешанковічы, Вялікая Бераставіца, Варапаева, Мсціслаўль, Рассоны, Хоцімск, Шаркаўшчына, у вёсках Крулеўшчына Докшыцкага, Гнілец, Дубавое і Асіповічы Драгічынскага, Калодзішчы Мінскага, Альшаны і Рубель Столінскага раёнаў [3, с. 146]. Аднак іх пералік у выданні, мяркуем, далёка няпоўны. У Брэсце ў 1962 годзе М.В. Гогалю пастаўлены помнік, таксама бібліятэкі № 2 у Бабруйску і № 4 у Мінску носяць яго імя.

На Гомельшчыне ў абласным цэнтры зафіксавана вул. ***Гогалеўская*** (былая ***1-я Стаханаўская***), вул. ***Гогаля*** ў гг.Добруш, Мазыр, Петрыкаў, Рэчыца, Рагачоў, г.п. Акцябрскі.

На тэрыторыі Калінкавіцкага раёна існуе айконім, матываваны прозвішчам геніяльнага рускага пісьменніка. Вёска ***Гогалеў*** (варыянт ***Гогалева***) знаходзіцца за 44 км на паўночны ўсход ад Калінкавіч, яна "вырасла" з хутара, які ўзнік у пачатку 30-х гадоў і на базе якога арганізавалі калгас імя К. Маркса [4, с. 146].

Такім чынам беларускі народ ушанаваў у сваёй тапаніміі памяць аб М.В. Гогалю, які сваёй біяграфіяй і дзейнасцю непасрэдна з Беларуссю не быў звязаны. І толькі яго імя на летапісным камені каля в. Мясота на 62 км па шашы Мінск – Маладзечна сведчыць, што па гэтым старым тракце праязджаў у свой час знакаміты рускі пісьменнік [3 с. 146].

ЛІТАРАТУРА

1 Багамольнікава Н.А. Гідронімы басейна ракі Прыпяць: структурна-семантычныя тыпы матывацыі. – Гомель: ГДУ, 2004. – 195 с.

2 Лемцюгова В.П. Беларуская айканімія. Лінгвістычны аналіз населеных пунктаў Мінскай вобласці. – Мн.: Навука і тэхніка, 1970. – 155 с.

3 Их именами названы…: Энцикл. справочник / БелСЭ; Редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред) и др. – Мн.: БелСЭ, 1987. – 711 с.

4 Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Калінкавіцкага р-на / Рэд.-укл. В.Р. Феранц; Маст. Э.Э. Жакевіч. – Мн.:Ураджай, 1999. – 798 с.

***Н.А.Бондарь (Украина)***

## ОСОБЕННОСТИ ПЕРЕВОДА СРАВНЕНИЙ НА УКРАИНСКИЙ ЯЗЫК (на материале повести Н.В.Гоголя «Майская ночь, или Утопленница»)

Сравнение является одним из наиболее распространенных тропов в произведениях художественной литературы. Оно представляет собой стилистический прием, основанный на образной трансформации грамматически оформленного сопоставления. Средствами грамматического оформления сравнений служат: 1) сравнительный оборот, вводимый

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ